# Перавернуты ўрок

## Вопыт арганізацыі «перавернутага» навучання на ўроках беларускай мовы

**«Перавернутае», або змешанае, навучанне дае настаўніку магчымасць павялічыць аб'ём зместу навучання за кошт арганізацыі педагагічнага ўзаемадзеяння ў электронным асяроддзі. З другога боку, такая мадэль навучання дазваляе больш эфектыўна арганізаваць урок — асноўную пляцоўку жывых зносін на роднай мове, неабходных для фарміравання ў вучняў моўных і маўленчых кампетэнцый.**

**Юлія ПАЎЛАВА**



**АЎТАР**
ЮЛІЯ СЯРГЕЕЎНА ПАЎЛАВА, НАСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ДУА «ГІМНАЗІЯ № 1 Г. БАРЫСАВА». ЗАКОНЧЫЛА ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «ФІЛОЛАГ. ВЫКЛАДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ». ЧЛЕН АБЛАСНОГА КЛУБА «ФЛАГМАН». ПЕДАГАГІЧНЫ СТАЖ — 14 ГАДОЎ.

Выкананне адной з асноўных задач навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі — фарміраванне навыкаў рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай маўленчай дзейнасці: асэнсаванага чытання, адэкватнага ўспрымання маўлення на слых, стварэння выказванняў у вуснай і пісьмовай формах, — патрабуе замацавання і паглыблення ведаў і ўменняў вучняў па фанетыцы і графіцы, лексіцы і фразеалогіі, марфалогіі і сінтаксісе, стылістыцы беларускай мовы. Гэта патрабуе актуалізацыі назапашаных у 5–9 класах ведаў для авалодання мовай на больш высокім узроўні — на ўзроўні тэксту.

Зыходзячы з таго, што на вывучэнне раздзела, напрыклад, «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення» адводзіцца 12 гадзін, настаўнік павінен забяспечыць актуалізацыю ведаў вучняў па тэме «Дзеяслоў як часціна мовы» за гадзіну. Наяўнасць дадзенай ды і іншых праблем прывяло да таго, што менавіта ў 10-м класе я пачала актыўна выкарыстоўваць такую незвычайную форму заняткаў як «перавернуты» ўрок.

Правядзенне «перавернутага» ўроку прадугледжвае, па-першае, змену пазіцый вучня і настаўніка ў адукацыйным працэсе, па-другое, патрабуе добрай падрыхтоўкі настаўніка і, па-трэцяе, звязана з павышэннем адказнасці вучня за сваё навучанне (рэалізуюцца прынцыпы актыўнай ацэнкі). «Перавернуты» ўрок не варта разглядаць толькі як змену месцамі класнай і дамашняй работы, бо ад механічнай перастаноўкі нічога не зменіцца. «Перавернуты» ўрок трэба разглядаць як арганізацыйную форму «перавернутага» навучання.

«Перавернутае» навучанне ўвасабляе так званае змешанае навучанне — мадэль, пабудаваную на аснове інтэграцыі і ўзаемнага дапаўнення тэхналогій традыцыйнага і электроннага навучання. У змешаным навучанні адбываецца замяшчэнне часткі традыцыйных вучэбных заняткаў рознымі відамі вучэбнага ўзаемадзеяння ў электронным асяроддзі. Зразумела, рэалізацыя такога падыходу да навучання патрабуе часу, бо немагчыма перавярнуць адукацыйны працэс за ўрок. Акрамя гэтага, трэба разумець, што, толькі авалодаўшы асновамі традыцыйнага ўрока, педагог зможа правесці эфектыўны ўрок любога тыпу, у любой форме!

Для таго каб прымяніць «перавернуты» ўрок, мы павінны спачатку навучыць сваіх вучняў працаваць самастойна ў класе пры падтрымцы настаўніка. І толькі тады можна спрабаваць «перавернутае» навучанне, бо яно прадугледжвае, па-першае, самастойнае навучанне і, па-другое, даверлівыя адносіны, адказнасць, свабоду ў выбары заданняў і рэжыму вучэбных дзейнняў. Выдатны педагог *Бенджамін Блум* у свой час выказаў гіпотэзу, якую потым пацвердзіў эксперыментальным шляхам: якасць атрыманых ведаў залежыць не ад здольнасцей вучня, а ад колькасці часу, які той патраціў на самастойную работу над заданнем!

Абавязковай умовай рэалізацыі тэхналогіі «перавернуты клас» з'яўляецца таксама наяўнасць электроннага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя, напрыклад сайта дыстанцыйнага навучання (як у нашай гімназіі), дзе вучні ў зручны для сябе час працуюць не на занятках у навучальнай установе, а дома за камп'ютарам.

Зразумела, не кожны ўрок можна і трэба будаваць па прынцыпах «перавернутага». У мяне, напрыклад, вельмі добра праходзяць такія ўрокі ў 10-м класе па раздзела «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення». Як гаварылася вышэй, на актуалізацыю ведаў па кожнай часціне мовы ў 10-м класе адводзіцца па гадзіне. У прыватнасці, у падручніку па беларускай мове для 10-га класа даецца адзін параграф, прысвечаны дзеяслову, а менавіта правапісу асабовых канчаткаў дзеясловаў. Таму, напрыклад, выкананне заданняў, звязаных са спражэннем дзеяслова, вызначэннем яго сінтаксічнай ролі, заўсёды выклікае цяжкасці ў вучняў.

Менавіта «перавернуты» ўрок дазваляе прапанаваць вучням неабходны матэрыял. Яго правядзенне мае на ўвазе размяшчэнне на сайце дыстанцыйнага навучання http://gimn1.of.by/moodle/ матэрыялаў у праграмах Microsoft Word, PowerPoint, з якімі вучням трэба пазнаёміцца дома, таксама можна дадаць відэаўрокі па дадзенай тэме або спасылкі на іх. Адразу трэба адзначыць, што гэтыя матэрыялы, якія садзейнічаюць актуалізацыі ведаў вучняў па тэме, я сама збіраю з розных крыніц і кампаную. Акрамя гэтага, трэба падкрэсліць, што выбраная функцыя дамашняга задання — актуалізацыя ведаў — вызначае і рэпрадуктыўны характар заданняў (*дадатак 1*), і паказчык («аналізуе і сістэматызуе моўны матэрыял; выконвае заданні па аналогіі»), і ацэнку іх выканання — 7 балаў.

Абавязковай умовай арганізацыі дамашняй работы ў рамках «перавернутага» ўроку з'яўляецца наяўнасць крытэрыяў «НаШтоБуЗу» (На Што Буду Звяртаць увагу), па якіх будуць ацэньвацца вынікі яе выканання. Нязменным крытэрыем ацэнкі з'яўляецца складанне трох пытанняў па вывучанай тэме (на разуменне, удакладненне і развіццё). Астатнія крытэрыі залежаць ад зместу ўрока.

Прывяду прыклад дамашняга задання па тэме «Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля» (10-ы клас).

Задачы:

1. Пазнаёміцца з матэрыяламі па тэме на сайце http://gimn1.of.by/moodle/ у раздзеле «Беларуская мова. 10 клас. Дзеяслоў».
2. Прагледзець прэзентацыю па тэме.
3. Сфармуляваць тры пытанні, якія ўзніклі па тэме.
4. Намаляваць кластар, схему ці табліцу, дзе адлюстраваць асноўныя катэгорыі дзеяслова.
5. Выканаць трэніровачны тэст «Дзеяслоў».
6. Выканаць заданні (*гл. дадатак 1*).
7. Зрабіць марфалагічны разбор дзеясловаў з апошняга сказа тэставага задання па схеме.

Вынікі выканання дамашняга задання ўсімі вучнямі класа адлюстроўваюцца ў выглядзе дыяграмы, а кожным вучнем — у выглядзе табліцы, дзе паказана, колькі хвілін вучань выконваў дадзенае заданне, колькі балаў ён атрымаў. Таксама бачны і вынікі выканання кожнага задання кожным вучнем. Гэта дазваляе настаўніку прадумаць план карэкцыі ведаў для асобнага дзіцяці. А самае галоўнае — зваротная сувязь з кожным вучнем. У час выканання трэніровачнага тэста вучань адразу бачыць, дзе памыліўся. Адразу ж ён можа звярнуцца да патрэбных матэрыялаў або задаць пытанне настаўніку па электроннай пошце і такім чынам ліквідаваць прабел у ведах. Калі ён недзе памыліўся, па электроннай пошце дасылаю яму

**«ПЕРАВЕРНУТЫ» ЎРОК — ФОРМА НАВУЧАННЯ, ПРЫ ЯКОЙ ВУЧНІ ДОМА ЗНАЁМЯЦЦА З ТЭАРЭТЫЧНАЙ ЧАСТКАЙ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ, А Ў КЛАСЕ ВЫКОНВАЮЦЬ ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ПА ПРЫМЯНЕННІ ВЕДАЎ.**

пісьмо з парадамі, дзе і што пачытаць ці падвучыць. Калі вучань справіўся паспяхова, дзякую яму і хвалю за працу. Кожны вучань чакае майго пісьма. Яму цікава: а што ж скажа настаўнік мне?

Актуалізацыя ведаў вучняў, забяспечаная выкананнем дамашняга задання, дазваляе на ўроку арганізаваць работу, накіраваную на замацаванне і паглыбленне ведаў і ўменняў вучняў, на аснове выканання заданняў аналітыка-сінтэтычнага характару, на трансфармацыю моўнага матэрыялу, са складаным моўным матэрыялам (*гл. дадатак 2*). Вучні, якія атрымалі станоўчыя адзнакі па трэніровачным тэсце і іншых заданнях, якія яны выконвалі дома, працуюць у парах са слабымі вучнямі, дапамагаюць ім у пошуку адказаў на пытанні, якія ўзніклі. Работу ўсяго класа, зразумела, кантралюе настаўнік. На ўроку мы можам зноў прагледзець тэст ці блок матэрыялаў, што вельмі зручна як для вучняў, так і для мяне (мой кабінет абсталяваны камп'ютарам, ёсць пастаянны выхад у інтэрнэт).

Сярод эфектаў «перавернутага» ўроку адзначу яшчэ адзін. Для кожнай установы адукацыі актуальнай з'яўляецца праблема пропуску заняткаў вучнямі па прычыне хваробы. Для гэтых вучняў я распрацоўваю індывідуальныя заданні і размяшчаю іх, як і неабходны матэрыял па прапушчаных тэмах, на дыстанцыйнай платформе. Вучань самастойна вывучае матэрыял, дасылае мне зробленыя заданні, а я па электроннай пошце дасылаю яму свае каментары і заўвагі.

Я лічу, што выкарыстанне такой формы навучання, як «перавернуты» ўрок дазваляе:

- па-першае, у сучаснай сітуацыі забяспечыць фарміраванне ў вучняў моўнай і маўленчай кампетэнцый;
- па-другое, садзейнічаць развіццю ў вучняў ініцыятыўнасці, здольнасці да самастойнага вырашэння праблем, камунікатыўных, інфармацыйных уменняў, а таксама павышэнню адказнасці за ўласнае навучанне.

Вучань становіцца суб'ектам пазнання, а не аб'ектам навучання. А кожны настаўнік — творчай асобай, якая дапамагае вучню паспяхова справіцца з цяжкасцямі, якія ўзнікаюць на шляху пазнання. Ⓜ

*Дадатак 1*

***Заданне 1.***

| Часціна мовы | Род | Лік | Склон | Час | Асоба | Тыповая сінтаксічная функцыя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Назоўнік** | Адрозніваецца па родах | Змяняецца па ліках | Змяняецца па склонах | | | Дзейнік<br>Дапаўненне<br>Зваротак |
| **Прыметнік** | Змяняецца па родах | Змяняецца па ліках | Змяняецца па склонах | | | Азначэнне |
| **Дзеяслоў** | **?** | **?** | **?** | **?** | **?** | **?** |

***Заданне 2.***

У прапанаваным тэксце знайдзіце і выпішыце дзеясловы I спражэння (варыянт 1) і II спражэння (варыянт 2).

*Беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. Шмат стагоддзяў карыстаюцца ім беларусы. Ткуць і расшываюць яго і сёння, працягваючы ўдасканальваць прыгажосць, над якой працавала мноства папярэдніх пакаленняў.*

*Цікавасць да гэтага прадмета абумоўлена не толькі прыгажосцю яго тканага, вышыванага або плеценага дэкору, але і цеснымі сувязямі з абрадавым жыццём народа, сімволікай шматлікіх функцый. Па-ранейшаму ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя этапы жыццёвага шляху чалавека.*

Ад выпісаных з папярэдняга тэксту дзеясловаў утварыце розныя яго формы (дзеепрыметнікі, дзеепрыслоўі).

***Заданне 3.***

Знайдзіце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні, запішыце выпраўленыя варыянты:

- ***паехаць за сенам;***
- ***захварэць грыпам;***
- *пайсці ў грыбы;*
- ***ажаніцца на Насці;***
- *смяяцца з сябра.*

***Заданне 4.***

Адзначце рады дзеяслоўных формаў, дзе зроблены памылкі, запішыце памылковыя варыянты правільна (1, 3, 4):

- *пець: пяю, пяеш, пяе, пяём, п'яце, пяюць;*
- *пячы: пяку, пячэш, пячэ, пячом, печаце, пякуць;*
- *церці: тру, трэш, трэ, трэм, трацеце, труць;*
- *браць: бяру, бярэш, бярэць, бяром, бяроце, бяруць.*

***Заданне 1.***

Ад прапанаваных дзеясловаў утварыце формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку, пастаўце націск: *бегчы, ткаць, берагчы, прасіць, сцерагчы, піць, вучыць, браць, жыць, весці, біць.*

Каментар: хоць вучні і разумеюць прынцып утварэння гэтай дзеяслоўнай формы, цяжкасці ўзнікаюць заўсёды, асабліва калі словазмяненне суправаджаецца гістарычным чаргаваннем зычных (ткаць – тчаце).

***Заданне 2.***

Дадзены корань *слова БЯР.* Утварыце ад яго дзеяслоў 2-й асобы множнага ліку, загаднага ладу, незакончанага трывання. Дзеяслоў павінен быць утвораны постфіксальным спосабам (*БЯРЫЦЕ*).

Дадзены корань *слова ЛІЧ.* Утварыце ад яго дзеяслоў 2-й асобы множнага ліку, загаднага ладу, закончанага трывання. Дзеяслоў павінен быць утвораны прыставачна-постфіксальным спосабам (*УЛІЧЫЦЕ*).

Дадзены корань *слова ВАСТР.* Утварыце ад яго дзеяслоў 1-й асобы адзіночнага ліку, абвеснага ладу, будучага часу, закончанага трывання. Дзеяслоў павінен быць утвораны прыставачным спосабам (*ЗАВАСТРУ*).

***Заданне 3.***

Прачытайце тэкст і выканайце наступныя заданні:

1. Узнавіце тэкст, уставіўшы патрэбныя дзеясловы прошлага часу.
2. Пазбаўце тэкст аманімічнасці, запісаўшы ў табліцы падкрэсленыя дзеясловы ў форме цяперашняга часу абвеснага ладу.
3. Зрабіце марфемны і сінтаксічны разбор трох дзеясловаў (на выбар).

*Дадатак 2*

*Сыравінай для ткацтва на Беларусі здаўна _____ лён, воўна, радзей пянька. У лістападзе ______ прасці. Іх <u>пралі</u>[1] пры дапамозе верацяна або калаўрота на працягу ўсяго тыдня, за выключэннем святочных дзён і нядзелі. Затым пражу _____ да ткання: бялілі або _______, снавалі.*

*У працэсе адбельвання маткі пражы _______ ў шчолаку, залівалі ў жлукце, _______ і развешвалі на сонцы.*

*Палатно вымочвалі, <u>пралі</u>[1], паласкалі, а затым ______ на роснай траве (прадвеснем на снезе) для бялення пад сонечнымі промнямі.*

*Асноўнай сыравінай для фарбавання ў хатніх умовах ______ натуральныя фарбавальнікі: адвары або настоі лісця, кары дрэў, сцяблоў, кветак, каранёў траў. У выніку змешвання розных кампанентаў _________ патрэбны колер.*

*Адказ:*

Сыравінай для ткацтва на Беларусі здаўна <u>служылі</u> лён, воўна, радзей пянька. У лістападзе <u>пачыналі</u> прасці. Іх *<u>пралі</u>*[1] пры дапамозе верацяна або калаўрота на працягу ўсяго тыдня, за выключэннем святочных дзён і нядзелі. Затым пражу рыхтавалі да ткання: бялілі або фарбавалі, снавалі.

У працэсе адбельвання маткі пражы <u>вымочвалі</u> ў шчолаку, залівалі ў жлукце, <u>паласкалі</u> і развешвалі на сонцы.

Палатно вымочвалі, *<u>пралі</u>*[2], паласкалі, а затым рассцілалі на роснай траве (прадвеснем на снезе) для бялення пад сонечнымі промнямі.

Асноўнай сыравінай для фарбавання ў хатніх умовах <u>служылі</u> натуральныя фарбавальнікі: адвары або настоі лісця, кары дрэў, сцяблоў, кветак, каранёў траў. У выніку змешвання розных кампанентаў <u>атрымлівалі</u> патрэбны колер.

| **Пралі[1]** | | **Пралі[2]** | |
|---|---|---|---|
| я праду | мы прадзём | я пяру | мы пяром |
| ты прадзеш | вы прадзяце | ты пярэш | вы пераце |
| ён прадзе | яны прадуць | ён пярэ | яны пяруць |